Інфармацыйны праект "ВОКА"
на старонках ZABEJ.INFO

# ВОКА

нумар 4

## БУДЗЬМА МАЛАДЫМІ

**Ад 1 кастрычніка 2008 г. мы, 11 арганізацый і ўстаноў, абвяшчаем адкрытую грамадскую кампанію "БУДЗЬМА!", прысвечаную Году беларускай дзяржаўнасці.**

Мы будзем ладзіць шматлікія культурныя і асветніцкія акцыі па ўсёй Беларусі: лекцыі па беларускай гісторыі і культуры, канцэрты беларускіх музыкаў і гуртоў, выставы нашых найлепшых мастакоў, сустрэчы з пісьменнікамі, прэзентацыі кніг, часопісаў і музычных праектаў і шмат іншага. Далучыцца да нас зможа кожны!

Мы будзем рабіць гэта, бо нам, беларусам, ёсць чым ганарыцца! У нас ёсць усё, каб заняць "свой пачэсны пасад між народамі" ў сучасным зменлівым свеце, дзе найбольш цэняцца самабытнасць, пачуццё ўласнай годнасці і яснае бачанне перспектывы. Мы маем нашу шматвяковую гісторыю, нашу разнастайную культуру, нашу непаўторную мову. Калі ўсе мы ўсвядомім гэтыя каштоўнасці, то на гэтым духоўным падмурку абавязкова здолеем збудаваць сучасную, заможную, еўрапейскую Беларусь.
Будзьма беларусамі гэта нас аб'ядноўвае, робіць унікальнымі і адкрывае шырокую перспектыву!

Будуйма Беларусь такой, якой будзем ганарыцца мы, нашы дзеці і ўвесь свет!

Будзьма беларусамі! Будзьма разам!

Ініцыятары кампаніі "Будзьма":
МГА "ЗБС "Бацькаўшчына", ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў", ГА "Таварыства беларускай мовы", суполка "Пагоня" пры БСМ, МГА "Гісторыка", творчы калектыў альманаху "pARTisan", ГА "Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры", Беларуская музычная альтэрнатыва, інтэрнэт супольнасць www.moladz.org, інтэрнэт-супольнасць "Шлях да Беларусі", Еўрапейскае радыё для Беларусі.

## У Мінску прайшла сустрэча праекту "Форум-тэатр"

**12 кастрычніка з ініцыятывы і пад кіраўніцтвам моладзевай інтэрнэт-супольнасці Moladz.org у рамках агульнабеларускай кампаніі "Будзьма" адбылася сустрэча маладых людзей пад назвай "Форум-тэатр", прысвечаная праблемам нефармальнай адукацыі.**

12 маладых людзей з 10 гадзіны раніцы па 7 вечара пад кіраўніцтвам 2 дасведчых трэнераў прымалі ўдзел у вывучэнні новай формы дадатковай адукацыі, накіраванай на ўсебаковае развіццё асобы праз нетрадыцыйныя адукацыйныя метады.

Заняткі складаліся з дзвюх частак. Першая частка мела форму гульні па развіцці адчуванняў, цягам якой удзельнікі вучыліся выяўляць свае пачуцці рознымі спосабамі, прымалі ролі агрэсара і ахвяры. Другая частка семінара была накіраваная на абмеркаванне асабістых праблемаў яго ўдзельнікаў і на распрацоўку ўласных сцэнараў па выхадзе з такіх сітуацый. Напрыканцы маладыя людзі ладзілі невялікія спектаклі, дзе кожны глядач мог раптоўна стаць іх непасрэдным удзельнікам, прыняць на сябе ролю актора і змяніць сітуацыю ў тым напрамку, які ён лічыў найбольш аптымальным.

У заключнай частцы сустрэчы арганізатары "Форум-тэатру" падвялі яго вынікі і падарылі ўдзельнікам кашулькі ад кампаніі "Будзьма". Арганізатары мерапрыемства засталіся задаволенымі вынікамі сустрэчы. "Форум-тэатр" праходзіў у цёплай абстаноўцы. Усе прысутныя актыўна ўдзельнічалі ў яго правядзенні, атрымалі шмат пазітыўнай энергіі і добры настрой. Мы будзем працягваць ладзіць нашыя семінары," адзначыла адна з трэнераў "Форум-тэатру" Надзея Сінкевіч.

БУДЗЬМА маладымі!

# “На шляху да сучаснага мастацтва”: крочым РАЗАМ




**У кожнага свой шлях, свой спосаб, сваё бачаньне сьвету, людзей, мастацтва і жыцьця. Сьведчаньне гэтаму - заключны этап міжнароднага мастацкага праекту, накіраванага на тое, каб раскрыць таленты маладых творцаў і паказаць жыцьцё з нестандартнага боку. Усё гэта зараз у Менску.**

Каму гэта патрэбна? Сотням людзей, якія мысьляць нестандартна, крэатыўна і шукаюць свае спосабы самавыражэньня. Арганізатарам выступіла нямецка-ўкраінска-беларускае грамадства “Эўропа бяз межаў” сумесна са сталічнай галерэяй “Подземка”. Для ўдзелу ў конкурсе зарэгістравалася больш за 60 маладых людзей розных спецыяльнасьцяў, агулам 7 праектаў было пададзена на разгляд журы.

Best of the best . Журы прызнала лепшымі наступныя праекты:

“Майстэрня 7-мі масткоў” (куратар Хрысьціна Сташкевіч).

“Мы прыйшлі з вуліцы” (куратары Андрэй Бусел і Лізавета Міхальчук).

Асобна хочацца сказаць пра праект “ФотаПары”. Ён адлюстроўвае новую форму партрэта гэта «арт-партрэт», канцэптуальны праект, дзе важную ролю грае пастановачная сітуацыя і новыя прасторы для здыманьня. Серыя партрэтаў Павала Восіпава прадстаўляе чалавека ў абсурдных абставінах, пачынаючы са зьнешняга выгляду мадэлі і сканчваючы прасторай. У адрозьненьні ад прац Павала, фотасьвет Яўгена Ацьцецкага досыць рэалістычны, просты і зразумелы: аўтар сустракае людзей, запрашае іх на здымкі і пры сустрэчы толькі ўважліва сочыць за іх дзеяньнямі. А вось дуэт Antonina паспрабаваў прадставіць чалавека ў нейкім вобразе, паказаць яго самую яркую якасьць, пагуляць зь яго зьнешнасьцю і настроем.

**Цікава, што гледачам прапаноўвалі таксама прыняць удзел у вырашэньні лёсу праектаў: кожны мог сфармуляваць сваё бачаньне трох лепшых праектаў.**

Emotions: тое, што застанецца. Выстава выклікае разнастайнасьць эмоцый, яркія пачуцьці і словы кшталту “настрой”, “гэта не глямурна”, “арт”, “неардынарна”, трэш, “што гэта значыць”. І варта пагадзіцца з дуэтам Antanina, якія лічаць, што “пра ўсе нашыя працы можна сказаць: неадназначныя. Гэта, бадай, самае галоўнае”.

Замест пасьляслоўя - падзеі +2). З 15 па 30 кастрычніка ў галерэі «Подземка» можна пазнаёміцца з каталогамі выстаў, якія адабралі для прэзентацыі ў межах праекту, а таксама з расейскімі тэкстамі некаторых тэкстаў з гэтых каталогаў. А 19 кастрычніка ў 16.00 у той жа галерэі адбудзецца закрыцьцё выставы-пераможца конкурса. У час закрыцьця ўсе ахвотныя маюць магчымасьць атрымаць абноўленую версію дыска «Bel Art» і дыск “На шляху да сучаснага музея 2008” з матэрыяламі конкурса. Зацікаўленым варта накіраваць ліст на e-mail : anna.samarie@gmail.com да 16 кастрычніка.

**Адар'я Гуштын**

# Яркі хаос Жданоў у фотаздымках. Сьвята працягваецца!

**Праходзячы па прашпэкту Незалежнасьці, не праходзьце міма: у кінатэатры "Цэнтральны" працягваецца фотавыстава, якая зьдзівіць вас арыгінальнасьцю ідэі і спалучэньнем аксэсуараў на фота. Прагледзеўшы яе, вам абавязкова захочацца наведаць рынак Жданы, дакладней - самую каларытную яго частку.**

**Рэспубліка Беларусь. Ждановічы**

Выстава фота-дызайну Артура Вакарава "Wonderland. Артыкулы Поля Цудаў" гэта экскурс па ўсім вядомай "барахолцы" ў Ждановічах. Аўтар распавядае, што "на працягу некалькіх месяцаў штовыходныя езьдзіў у Ждановічы за чароўнай дозай творчага кайфу. Шукаў сваю выяву сярод неймавернага гармідару Поля Цудаў. Кіраваўся пры здымках адзіным правілам здымаць менавіта так, як стаяла-вісела-ляжала. Ніякіх пастановак. Апроч здымкаў, вельмі цікавым былі зносіны з "цудатворцамі", "жыхарамі" Поля. Часта гэтыя зносіны былі неабходнай умовай атрыманьня дазволу на здыманьне "тавараў".




Кожная рэч мае сваю гісторыю. У гэтым пераконваешся, калі бачыш на фотаздымку аўдыёкасеты і шарыкавыя мышкі, лялькі Барбі ўзору 90-х і савецкія берцы.
Працы Артура Вакарава гэта спалучэньне 100% дакумэнталістыкі і яркага аўтарскага дызайну, дзе важны кожны колер, прадмет і асацыяцыя. Яркія фарбы і вобразы падымаюць настрой, і хочацца самой адправіцца на Ждановічы, каб убачыць на свае вочы, так бы мовіць, працяг выставы. Сам аўтар фотаздымкаў прызнаецца, што "дадзеная выстава з'яўляецца хутчэй папярэдняй справаздачай пра напрацаваны матэрыял".

**Убачыць на свае вочы**

Працы Вакарава насамрэч захопліваюць настолькі, што працяг "цудаў" хочацца ўбачыць найхутчэй. Таму еду на Жданы-барахолку самастойна.
Адпраўляцца на гэтую частку рынку са сьпісам таго, што трэба набыць, бессэнсоўна, бо заўсёды можна нечакана натыкнуцца на цікавостку і дзіва, якога так не хапала ў вашай кватэры ці нават у жыцьці. Тут шмат жалезак, якія пасьпяхова "сышлі" з мясцовых прадпрыемстваў і каштуюць у два разы таньней, чым у крамах. Тут адзеньне, якое больш не апрануць дзеці 80-х, і цацкі, зь якімі яны больш не пагуляюць. Тут медалі і ордэны дзядоў, якія абаранялі нашу Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну. Кошт узнагарод, дарэчы, пачынаецца ад 10 тысяч рублёў. Праходзячы шэрагі, якія знаходзяцца на незаасфальтаванай дарозе, можна вывучаць савецкую гісторыю ў партрэтах і бюстах: Ленін і Дзяржынскі, Кіраў і Брэжнеў, Маякоўскі і Ясенін... Кнігі, якімі зачытваліся нашыя бабулі («Поднятая целина», «Как закалялась сталь», «Мать» і інш.), зараз каштуюць капейкі. Пузатыя самавары і запыленыя грамафоны перадаюць увесь рэтра-дух. Гэта варта таго, каб убачыць!
Шмат рэчаў, якія ўтвараюць творчы яркі хаос, здолеў "злавіць" і "затрымаць" у сваіх працах фота-дызайнер Артур Вакараў. Яго "Поле цудаў" можна ўбачыць да 17 кастрычніка ў галерэі "Ўнята", што ў мінскім кінатэатры "Цэнтральны".

**Адар'я Гуштын**

## Дашлі тры паказкі і атрымай падарунак!

**Маладзёвая інтэрнэт-супольнасць moladz.org распачынае конкурс у межах кампаніі "Будзьма"! Калі ты таленавіты малады чалавек ці дзяўчына, валодаеш творчымі здольнасцямі і імкненнем да актыўнага ўдзелу ў культурным жыцці краіны, гэты конкурс для цябе!**

Усё, што табе патрэбна для ўдзелу ў ім свежыя, арыгінальныя думкі ды выхад у інтэрнэт. Прыдумай свой слоган, паказку альбо верш да кампаніі "Будзьма" і дашлі іх на скрыню vkonkurs@gmail.com (з пазнакай "Будзьма"). Да разгляду будуць прымацца "новыя літаратурныя павевы", у якіх ужываецца слова "Будзьма". Конкурс мае доўжыцца цягам месяца.

Самыя таленавітыя і неардынарныя вынаходнікі атрымаюць падарункі ад кампаніі "Будзьма".

БУДЗЬМА МАЛАДЫМ! Будзьма крэатыўным! Будзьма ўдзельнікам конкурсу!